**ИЗВЕСТИЯ НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ**
**Серия гуманитарных наук**

ПРАВІЛЫ ДЛЯ АЎТАРАЎ

1. Артыкул падаецца ў двух экзэмплярах на беларускай мове. Да артыкула неабходна вызначыць індэкс па Універсальнай дзесятковай класіфікацыі (УДК). Артыкул суправаджаецца накіраваннем установы, у якой выканана даследаванне, выпіскай з пратакола пасяджэння вучонага савета, аддзела або кафедры, рэцэнзіяй.

2. Аб'ём артыкула (тэкст, літаратура, рэферат на рускай мове, рэзюмэ на англійскай мове, табліцы) не павінен перавышаць 15 старонак. Рэферат (2 экз.) і рэзюмэ (2 экз.) падаюцца на асобных лістах. Колькасць малюнкаў -- не больш трох.

3. Літаратура, выкарыстаная ў артыкуле, падаецца на асобным лісце; спасылкі ў тэксце даюцца парадкавым нумарам у квадратных дужках (напрыклад, [1]). Спіс літаратуры павінен быць афармлены такім чынам:

а) для кніг: прозвішча аўтара, ініцыялы, поўная назва кнігі, месца выдан ня, год выдання, нумар тома;

б) для часопісных артыкулаў: прозвішча аўтара, ініцыялы, поўная назва артыкула, назва часопіса, год, нумар, старонкі ад -- да;

в) для газет: назва газеты, год, лічба, месяц.

4. Спасылкі на неапублікаваныя працы не дазваляюцца.

5. На асобным лісце ўказваюцца прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго адрас, нумар тэлефона і поўная назва ўстановы, дзе ён працуе.

6. Разам з артыкулам падаецца дыскета стандартнага фармату. Электронны варыянт павінен быць набраны ў Word пад Windows. Для формул -- формульны рэдактар Word або Mathtape. Формульным рэдактарам у Word карыстацца толькі для набору складаных формул.

Малюнкі даюцца ў выглядзе асобных файлаў у фармаце TIF (для IBM) або ў фарматах, створаных у пакетах Photoshop, Coreldraw, Adobe Illustrator (IBM, Macintosh). Сфарміраваны ў Word графічны малюнак аб'яднаць у групу або зрабіць яго праз опцыю стварэння малюнка.

7. Карэктуры артыкулаў аўтарам, як правіла, не дасылаюцца. У выпадку пасылкі карэктура павінна быць вернута ў рэдакцыю не пазней наступнага дня пасля атрымання яе аўтарам. Затрымка карэктуры не прыпыняе друка ванне артыкула.

8. У тым выпадку, калі аўтару вяртаецца артыкул для выпраўлення або скарачэння, датай падачы лічыцца дзень атрымання рэдакцыяй канчатковага тэксту.